Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У.І. Слабодчыкава ”

Матэматыка, 1 клас
(па праграме 2 класа
1 аддзялення
для вучняў
з інтэлектуальнай недастатковасцю)

# Тэма: Рашэнне простых задач на знаходжанне невядомага складаемага, памяншаемага, аднімаемага

Настаўнік-дэфектолаг
Н.А.Цімашчук

**Тэма: Рашэнне простых задач на знаходжанне невядомага складаемага, памяншаемага, аднімаемага**

**Мэта:** 1) замацаванне вывучаных вылічальных прыёмаў складання і аднімання,паўтарэнне складу ліку 10 ,паўтарэнне паслядоўнасці лікаў у межах 10,замацаванне навыка рашэння задач у 1 дзеянне на знаходжанне складаемага,памяншаемага, аднімаемага;

2) удасканаленне мысленчых аперацый ,развіццё мовы; развіццё матэматычных навыкаў;

3)выхаванне акуратнасці,узаемапавагі.

**Абсталяванне:** падручнік,сшытак,камп'ютар,***камп'ютарная гульня"Склад ліку",***дыдактычны матэрыял да гульні "Упрыгожым елку" (сняжынкі, шары),набор картак з лічбамі.

**Ход работы**

**I.Арг.момант**

-Добры дзень.Які зараз у нас урок?Ты гатова да ўрока?

Зараз праверым:

Рукі? –на месцы

Ногі? – на месцы

Спіна? – прамая

**II.Вуснае лічэнне.**

-Перш,чым пачаць працаваць над тэмай урока,якую я пазней абвяшчу,патрэніруем сваю памяць.Сядай за камп'ютар.Цябе чакае гульня "Склад ліку".

**<u>Зрокавая гімнастыка</u>**

**III.Асноўная частка.**

-Зараз з дапамогай лічбаў,якія запісаны на палосках паперы,ты прачытаеш тэму нашага ўрока (**Рашэнне простых задач на знаходжанне невядомага складаемага,памяншаемага,аднімаемага –** чытае вучань)

-Хутка да нас прыйдзе свята,якое вельмі любяць дзеці (Новы год).Якое дрэва ўпрыгожваюць людзі на гэтае свята? (Елку)

У нас таксама ёсць елка і мы яе ўпрыгожым цацкамі,калі правільна будзем рашаць прыклады і задачы.

1)работа з падручнікам: ст.43 №1 (рашаем прыклады ,шукаем шар з правільным адказам і вешаем на елку)

2)рашэнне задачы з выкарыстаннем малюнка(малюнак вучаніца складае з выразаных дэталей-дрэва,слімак): ст.43 № 2

IV.Фізхвілінка

**V.Замацаванне вывучаных прыёмаў вылічэння.**

-Праверым рашэнне прыкладаў.Можна выкарыстаць лінейку для лічэння.Прыклады з правільныі адказамі вешаем на елку.

Хутка наша елка памяняе назву т.як упрыгожанае дрэва называюць ёлкай.

**VI.Вынік.**

-Чым займаліся на ўроку?

Як елка ператваралася ў ёлку?

**VII.Рэфлексія.**

-На нашай ёлцы не хапае прыгожай вярхушкі.Вось перад табой дзве зорачкі з надпісамі: было цікава,было не цікава.Выберы і упрыгож ёлачку той,якая будзе адпавядаць нашаму уроку.

Д/з заданне:ст.44 №5

-Дзякуй за працу на ўроку.Ты маладзец!